намэнклятуры часоў канца СССР заканамерную і абгрунтаваную падазронасьць.

У 20-я гады *суполка* ўжывалася вельмі шырока. Вацлаў Ластоўскі ў сваім слоўніку прыводзіць наступныя прыклады: *суполка шаўцоў, краўцоў, выдаўцоў. Суполкамі* называліся нават сялянскія каапэратывы. Пры канцы 80-ых гэтае слова, зноў уведзенае ў мову маладымі адраджэнцамі, набыло трывалую рэпутацыю апазыцыйнасьці. „Майстроўня“, „Талака“, „Тутэйшыя“ — усё гэта былі *суполкі*, якія замацавалі за словам шлейф андэграўнду і нефармальнасьці. Давершыла карціну зьяўленьне *суполак БНФ*. Дый цяпер нікому ня прыйдзе ў галаву назваць *суполкай* калгас альбо групу чыноўнікаў, паколькі *суполка* — гэта аб'яднаньне вольных людзей...

# Сухоты

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Сухоты.* Гэтая хвароба падбіралася да беларусаў спакваля. У XIX стагодзьдзі яна забрала ад нас паэта Ўладзіслава Сыракомлю і Віктара Каліноўскага — старэйшага брата вялікага Кастуся.

У XX стагодзьдзі — Максіма Багдановіча, Івана Луцкевіча, Алеся Гаруна, Казіміра Сваяка, Алеся Бурбіса... Сьпіс можна доўжыць і доўжыць.

*Сухотнік, сухотніца, сухотны.* Сынонім сухотаў, якога, дарэчы, не фіксуюць шмат якія беларускія слоўнікі — *тубэркулёз.* Яшчэ адзін сынонім — *мадуха* — запісаў на Полаччыне Вацлаў Ластоўскі. У бальшыні іншых славянскіх моваў слова *сухоты* гучыць так, як і ў нас.

У 1928 годзе ў Менску заснаваны і дагэтуль працуе *Беларускі навукова-дасьледчы інстытут вывучэньня сухотаў.*

Навука цьвердзіць, што рост *сухотных* захворваньняў часту зьвязаны з пагаршэньнем умоваў чалавечага жыцьця. Гэты, калі можна так сказаць, баромэтар нельга падмануць ані паказчыкамі эканамічнага росту, ані прапагандысцкай рыторыкай. Канец XX стагодзьдзя ў Беларусі адзначаецца павелічэньнем колькасьці *сухотнікаў*...

# Сыянізм

***Віталь Тарас***

Паводле Тлумачальнага слоўніка беларускае мовы, „*сыянізм*“ — гэта „рэакцыйныя ідэалогія і палітыка яўрэйскай буржуазіі, якія адрозніваюцца ваяўнічым шавінізмам, расізмам, антыкамунізмам і антысаветызмам. Ад назвы гары *Сіён* паблізу Іерусаліма“.

Слова „*сыянізм*“ было страшнейшае за словы „нацыяналізм“ і „фашызм“, якія афіцыйна быў разгромлены ў 1945-м. І ўсё з-за „бязродных касмапалітаў“ ды лекараў-забойцаў, якія хацелі атруціць таварыша Сталіна...

Ідэя барацьбы з *сыяністамі* ня згасла й пасьля сьмерці „бацькі народаў“. Напрыклад, у Беларусі выкрывалі прыкметы сусьветнае жыдамасонскае змовы ў нацыянальным беларускім дэкоры і нават у выявах сьняжынак, шукалі *сыянісцкія* матывы ў творчасьці сусьветна вядомых мастакоў Марка Шагала й Барыса Заборава. У выніку імя вялікага нараджэнца Віцебску Шагала яшчэ